


# Вераб'іная ноч...

— ДЫК ВОСЬ, браткі, было гэта аднойчы вечарам. Выйшаў я прагуляцца на вуліцу, падыхаць свежым паветрам, на людзей паглядзець і сябе паказаць. Ды і наогул, гавораць, што вячэрні моцыён вельмі карысны для здароўя... Іду гэта я, агнямі любуюся. Прыгажосць! Гляну ў я ўлева і ўбачыў яшчэ адзін высокі прыгожы будынак. Свецяцца агнямі ягоныя вокны, вабяць — клічуць да сябе. «Чакай, — схамянуўся, — дык гэта ж новы інтэрнат універсітэцкі. Яго не так даўно пабудавалі на месцы пустэчы. А ці не зайсці мне туды зноў, праведаць сваіх землячкоў. Парадкі ў іх, мабыць, змяніліся з таго часу, як я там гасцяваў...».

Як задумаў, так і зрабіў. Трушком падаўся я ў той бок. Толькі падыйшоў да інтэрната, як успомніў: няма пашпарта пры сабе, дакументаў ніякіх. А без іх жа у інтэрнат не пусцяць: загад прарэктара ёсць, і даволі строгі—ніводнага без дакумента не пускаць. Што ж рабіць. Рашыўся ўсё-такі зайсці. А мо' прапусцяць?

Ціхенька тарганув дзверы, зайшоў, агледзеўся. За сталом дзяжурнага сядзела дзяўчына. Прыгожая такая, чарнавокая. Я разгублена ўсміхнуўся ей.

— Вы да каго?

— Я хацеў бы да знаёмых, да землякоў наведацца.

— Ды кіньце вы, «да землякоў», — здагадліва ўсміхнулася прыгажуня. — Хочаце землякоў на танцах адшукаць, але і танцаў сёння не будзе. А вы мінчанін?

«Ого! Усё добра, — падумаў я, — інтрыжка камедыйная завязваецца. І чамусьці успомніў Пушкіна: «Я не той, хто Вы думаеце. Я не француз Дэфорж, я—Дуброўскі».

Я зрабіў нешта накшталт паклону, яшчэ раз усміхнуўся дзяўчыне, як добрай знаёмай, і слізгануў у калідор.

Добра, калі цябе ніхто не суправаджае. Шыбую гэта я калідорам. І раптам... Раптам чую нешта незвычайнае. Гэта былі хуткі гукі джунгляў Амазонкі, чым паўсядзённы шум інтэрната. Рашыў я цікнуць: што такое? Асцярожна прыблізіўся. Ага! пакой № 90. Пастукаў у дзверы: няма адказу. «Не чуюць!» Я грымнуў мацней.

— Уваліся, калі не д'ябал!, — азваўся хтосьці.

Зайшоў у пакой і адразу ўсё знікла, растала ў едкім сінім дыме. Уражанне было такое, нібы тут наладзілі вэнджанне шынак ці каўбас якіх. Але, нарэшце, я зразумеў, што хлопцы ўсяго толькі кураць, а дыму было, што, як кажуць, хоць тапор вешай. З цяжкасцю разглядзеў твары хлопцаў. Гэта былі жыхары 90-га пакою: Юра Глазкоў, ён жа староста, Л. Арсенцьеў, В. Садоўскі, В. Зінкевіч.

— Ат, надакучыла мне грымець касцяшкамі, — лянiва прамармытаў адзін з «казлятнікаў».—Давайце лепш у прэферансік перакінемся. Як-ні-як, гульня ўсе ж арыстакратычная...

Аматарам арыстакратычнай гульні засупярэчылі прыхільнікі больш народнай — «дурня падкіднога».

— А ці не лепш было б бутэлькі зацягнуць у магазін,—прапанаваў трэці. — Глядзіш, і па шклянцы звергнім.

Гэта прапанова была сустрэта, як пішуць у газетах, гучнымі апладысментамі .

А тым часам староста пераконваў мяне:

— Ты, Даніла, не думай, што у нас пакой дрэнны. Ты лепш зайдзі ў 20 або 21 пакой, дзе жывуць мае аднакурснікі.

Я вышаў на калідор і глянуў на сябе ў люстэрка. Мурзаты, закопчаны твар пазіраў на мяне.



Ахвотна займаюцца студэнты філалагічнага факультэта ў стралковай секцыі. Хутка ім прадстаіць адстойваць спартыўны гонар свайго факультэта ў спаборніцтвах па стральбе з малакаліберцай вінтоўкі сярод іншых факультэтаў універсітэта.

**НА ЗДЫМКУ:** студэнткі І курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Яўгенія Селюк і Ліля Доўнар на трэніроўцы.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# ...альбо Даніла Шыла ў землякоў

— Трэба памыцца.

Пасунуўся ў бок умывальніка, але без мыла — якое мыццё? Успомніў, што ў мяне ёсць знаёмыя ў 219 пакоі, што на чацвёртым паверсе. Тут жывуць студэнты другога курса матэматычнага факультэта. Ледзь я адчыніў дзверы, як на падлогу грымнула нешта цяжкае, за маленькім не адбіўшы мне ногі. Гэта жыхар 219 пакою Шалыгін, нягледзячы на позні час, займаўся гімнастычнымі практыкаваннямі з гірамі. Расказваюць, што ён заўзяты спартсмен, пананосіў гэтулькі спартыўных прылад, што яны нават не змяшчаюцца у шуфлядзе. Таму Шалыгін трымае іх на ўласным ложку, прытрымліваючыся прынцыпу: «Мой ложак, што хачу, тое і кладу. Хачу сам лягу, хачу — гантэлі палажу».

Але гэта яшчэ не ўсё. Як сцвярджаюць жыхары вышэй азначанага пакою, Шалыгін, як індыйскія іёгі, нават спіць на гэтых прыладах з мэтай загартаваць свае цела. Нават замест папружкі хлопец падперазваецца эспандэрам.

Захапіўшы мыла, рушыў я ва ўмывальнік. Калі праходзіў міма кухні на трэцім паверсе, у носе прыемна заказытаў пах смажанага сала. Ну, думаю, тут можна да дзяўчат на вячэру трапіць.

Сунуў я нос на кухню, ды тут жа назад падаўся. Божа ж мой, што там тварылася! Каструлі стаялі пасярод гор шкарлупак, на пліце валялася шалупінне ад цыбулі, у кутку ўзвышаліся цэлыя Гімалаі смецця. У мяне адразу ж знік увесь апетыт. Ну не, маніце, Даніла не будзе есці страву, прыгатаваную ў такіх умовах.



Было гэта ў 251 пакоі. Староста Людміла Цімчанка папрасіла сфатаграфаваць іх пакой як самы-самы ўзорны ва ўсім інтэрнаце. Шчоўкнуў я і нават некалькі разоў. Праявіў дома плёнку— і што б вы думалі! На ўсіх кадрах адзін і той жа малюнак, які вы і бачыце.

— Што за ліха, — падзівіўся я, але нарэшце сцяміў — не падвёў мяне аб'ектыўны аб'ектыў майго фотаапарата.

Фота Данілы Шылы.

Чакайце, я здаецца, захапіўся і адхіліўся ў бок ад свайго расказа. Значыць, дабраўся, нарэшце, да ўмывальніка. Падышоў да першай ракавіны і жахнуўся. Там было столькі макулатуры і рознага хламу, што адразу прыйшла думка: каб калі-небудзь сюды наведаліся піянеры аднаго з атрадаў, яны б, напэўна, абставілі ўсе іншыя класы па здачы утыльсыравіны. Кінуўся да другой ракавіны — тое ж самае. А таму, што пад ногі не глядзеў, дык паслізнуўся і бразнуўся з усіх чатырох. Падлога падвяла. Слізкая, залітая вадою, закіданая бульбяным шалупіннем, камякамі паперы, яна не была тым месцам, дзе можна было трывала стаяць на нагах.

Устаў я, абтросся і рушыў да дзвярэй. Але не тут то было! Тарганув я адзін раз—асечка, тарганув другі—не пячэ! Цьфу, што за д'ябал? Аказваецца замок у дзверах даволі мудрагелісты, амаль аўтаматычны, а ручка адламана, вось яны самі і зачыніліся.

Засумаваў было я. Крычаў, гукаў, барабаніў у дзверы—ні гука звонку. Што заставалася рабіць? «Пераначуем—больш пачуем» — успомніў народную прымаўку і так-сяк прымасціўся на падваконніку, каб хаця крыху ўздрамнуць. Адно толькі суцяшала мяне. Павінен жа раніцай хто-небудзь прыйсці мыцца!

Адчак лёс быў літасцівым. Гадзін каля чатырох ночы мяне выпусціў нейкі студэнт, які з сабой у кармане прынёс шпянькoвую ручку, накшталт той, якой праваднікі адчыняюць дзверы ў вагонах.

— Ну дзякуй табе, браце, —ад усяго сэрца выпаліў я і паклыпаў сабе да дому.

Але дабрацца да выхаду ў інтэрнаце аказалася нялёгкай справай. Ісці ж даводзілася амаль увесь час зажмурыўшыся. Я хлопец сарамлівы, малады, а тут у кожным кутку парачкі закаханыя, якім і ноч не ў ноч была, і якія, як вядома, «часов не наблюдают», нягледзячы на строгі загад рэктара аб рэжыме дня студэнта і захаванні распарадку дня ў інтэрнатах.

А бо я ішоў зажмурыўшыся, дык ледзь не наляцеў на чалавека, які, быццам прывід, блукаў па калідорах. На маё шчасце гэта была не цень бацькі Гамлета, а сам камендант Георгі Міхайлавіч Рабцэвіч.

— А здароў, братка Даніла, — узрадаваўся ён, — вось добра, што ты зноў завітаў да нас. Даўно трэба было, даўно...

І тут жа паскардзіўся:

— Ведаеш, танцоры замучалі... Жыцця не даюць. На чацвертым паверсе, дзе жывуць біёлагі, а другой гадзіне ночы танцы стыхіна ўзнікаюць. Прыходзіцца, нібы няньцы, разводзіць верных паклоннікаў Тэрпсіхоры за ручку па пакоях.

— І ўсе гэта — аднаму, — з адчаем працягваў камендант, — бо члены і старшыня студсавета У. Караваеў і ў вус не дзьмуць. Калі каго і выклікаюць на пасяджэнне, дык лагодненька так пагутараць і на гэтым кропка.

— Ну і жыхары ў вас, — падзівіўся я.

— Не, не думайце, што ўсе такія, — засупярэчыў Георгій Міхайлавіч — узяць хаця б на тым самым юрфаку пакоі № 19, 5, 61, 67, на біялагічным факультэце № 181, 197, геаграфічным № 73, 48, гістарычным № 80, 121, хімічным № 134, 237, дзе старастамі Эдуард Кампіцкі, Аляксандр Арэхаўскі, Алёна Вадзянава, Васіль Брэхуноў, Валянціна Бондар, Людміла Русак, Ніна Махлай, Людміла Гірыловіч, Аляксандр Галкоўскі, Святлана Сіманькова, Тамара Каратаева, Алёна Сарока. Вось з каго трэба браць прыклад! Вось туды зайдзі, Даніла!

Але час быў не такі, каб хадзіць па пакоях.

— У другі раз зайду, — паабяцаў я, — абавязкова! А пакуль што—да пабачэння.

Ваш ДАНІЛА ШЫЛА.



У музеі не страшна прывітацца за руку нават з мядзведзем...

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# „Я веру людзям"

За лета ў буфеце гуманітарнага корпуса мала што змянілася. А змены ўсё ж былі. Чыстыя занавескі на вокнах і новы стол, круглы і вялікі. Ён быў засланы белым абрусам і застаўлены рознымі прысмакамі: булачкамі, коржыкамі, малочнымі бутэлькамі і яшчэ шмат чым. Каля кожнага прадукта была ўказана цана. Невялікі плакацік тлумачыў—«Буфет без прадаўца».

Радасна было, што буфетчыца тав. Каваленка паклапацілася, каб я, як і дзесяткі другіх студэнтаў, не марнеў у доўгай чарзе, а паеў своечасова і хутка. І прыемна было, што гэты добразычлівы чалавек давярае мне, як і сотням другіх студэнтаў.

І студэнты ахвотна карысталіся «Буфетам без прадаўца», моршчылі ілбы, старанна падлічваючы, хто на колькі ўзяў, асцярожна бралі рэшту з фаянсавай талеркі, баючыся ўзяць незнарок лішнюю капейку: справа ж ішла аб гонары і сумленні ўсіх студэнтаў разам і кожнага паасобку.

Але аднойчы «Буфет без прадаўца» знік. Круглы стол стаў простым абедзенным сталом. На ім стаялі пустыя бутэлькі з-пад кефіру...

— Валянціна Яўгенаўна, — звярнуўся я да таварыш Каваленкі,—а дзе ж ваш памочнік?

— Быў ды сплыў,—жартам адказала Валянціна Яўгенаўна.

—Якім чынам?—дапытваўся я.

Тав. Каваленка пасур'ёзнела:

— Ведаеце, доўгі час усё ішло добра. Усё зыходзілася, што называецца, кропка ў кропку. Але аднойчы пасля працоўнага дня я недалічылася 31 рубля. Прадукты ўзялі, а грошы... грошы не палажылі, не разлічыліся. Прышлося ў касу аддаць свае грошы, а памочніка закрыла.

Буфетчыца памаўчала, потым таропка загаварыла зноў:

— Не сказаць, каб я перастала верыць людзям, але проста няма ўжо той смеласці. І неяк не верыцца, што сярод студэнтаў знайшлося адзін-два чалавечкі, якія плююць на ўсе добрае і, у першую чаргу, на сваіх жа таварышоў...

Наша размова скончылася нечаканым для мяне паваротам.

— Не сёння-заўтра, — сказала Валянціна Яўгенаўна Каваленка,—я зноў адчыню «Буфет без прадаўца». Ён значна дапаможа і мне, і вам, студэнтам. І яшчэ: я ўсё ж веру людзям.

І. ПАТАПАЎ.

**СПЫТАЙ У КНІГАРНІ**

Выдавецтва Акадэміі навук БССР выпусціла ў свет новыя наступныя кнігі:

**Беларуская літаратура.** Даследаванні і публікацыі, вып. III. 236 стар. Цана 8 руб. 30 кап. На беларускай мове:

**Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года.** Тэкст, пераклад, каментарыі. 254 стар. Цана 12 руб. 35 кап. На рускай мове.

**Беларуская ССР у міжнародных адносінах.** Міжнародныя дагаворы, канвенцыі і пагадненні Беларускай ССР з замежнымі дзяржавамі (1944—1959). 1050 стар. Цана 18 руб. 60 кап. На рускай мове.

**Ф. Янкоўскі. Дыялектны слоўнік,** вып. другі. 236 стар. Цана 3 руб. 80 кап. На беларускай мове.

**А. І. Воранава. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг.** 236 стар. Цана 4 руб. 35 кап. На беларускай мове.

Рэдактар М. Цікоцкі.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31;
Тэлефон: 2-07-19.

Друкарня выдавецтва
БДУ імя Ул. І. Леніна.

АТ 00551. Зак. 2042.